**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за ліпень 2018 г.

У ліпені ў публічных бібліятэках ДУК працягнуўся раённы конкурс летняга чытання “Канікулы ў бібліятэцы”. У рамках конкурсу бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў.

### <u>Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу летняга чытання “Летом с книгой я дружу”</u>

***4 ліпеня***

У час правядзення вуснага часопісу “Ты жывеш у Беларусі”дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах "Ведай і размаўляй", адказвалі на пытанні віктарыны "Вядомыя і знакамітыя", знаёміліся з беларускімі выданнямі-юбілярамі, выконвалі жартоўныя заданні, збіралі галаваломкі і адгадвалі загадкі. Пераможцы атрымалі у якасці прызоў **льготныя** чытацкія білеты на права карыстання дадатковымі паслугамі бібліятэкі.

Шамятоўская ПБ, 31 чал.

***7 ліпеня***

Удзельнікі пазнавальна-конкурснай праграмы “Наш дом – Беларусь” здейснілі завочнае падарожжа па знакавых мясцінах Беларусі, адбылося знаёмства з гістарычнымі дзеячамі і знакамітымі людзьмі. Вучні прынялі ўдзел у краязнаўчай віктарыне пра спадчыну роднага краю. Мерапрыемства суправаджалася мультымедыйным паказам “Наш дом – Беларусь”.

Імянінская ПБ, 17 чал.

***8 ліпеня***

Літаратурна-спартыўнае свята “Моладзь за здаровы лад жыцця” бібліятэкар правяла на свежым паветры, пляцоўцы каля бібліятэкі. Вядучая прапанвала старшакласнікам літаратуру пра здаровы лад жыцця, правяла дыспут пра асноўныя складальнікі здаровага ладу жыцця, пра шкоду алкаголя, наркотыкаў, курэння. Дзеці актыўна ўдзельнічалі ў спартыўных гульнях “Хто першы”, “ Здаровая ежа” і інш.

Магдалінская ПБ, 19 чал.

***12 ліпеня***

У час правядзення пазнавальна-конкурснай праграмы “Территория дружбы”. каманды “Светлячки” і “Пингвины” спаборнічалі ў конкурсах: “Героі-сябры”, “Падбяры прыказку”, “Пантаміма”, “Законы сяброўства”, “Песенны”, “Далонька”, чыталі вершы пра сяброўства, успаміналі прыказкі. Дзеці прагледзелі відэаролік і мультфільм пра сяброўства, даведаліся пра самыя важныя якасці сяброў.

Арэхаўская ПБ, 22 чал.

***20 ліпеня***

У госці да дзяцей на літаратурна-гульнявую праграму “Неразлучныя сябры – кніга, лета і я” з'явілася Баба Яга. Пад музычнае суправаджэнне, гучныя апладысменты і смех казачная госця танцавала разам з дзецьмі, загадвала загадкі. У завяршэнні мерапрыемства ўсе жадаючыя змаглі бліжэй пазнаёміцца з кнігамі, прадстаўленымі на выставе-праглядзе “Казачная паляна”.

Буховіцкая ПБ, 25 чал.

***22 ліпеня***

У час правядзення гадзіны цікавай інфармацыі “Што такое драканіды” вучні малодшых класаў разам з бібліятэкарам адправіліся на сустрэчу з дзедам Прыродазнаўцам па кнігах серыі “Рассказы деда Природоведа”. На старонках кніг юных чытачоў чакалі адказы на мноства пытанняў, а гульнятэка дзеда Прыродазнаўца прапанавала дзецям займальныя галаваломкі і віктарыны.

Лукская ПБ, 19 чал.

***22 ліпеня***

Удзельнікі гадзіны бяспекі “Огонь опасен, к сожаленью, для всех людей без исключенья” пазналі пра карысныя і небяспечныя ўласцівасці агню, адказалі на пытанні віктарыны “Огонь в нашей жизни” і пагглядзелі відэапрезентацыю аб зломаных і самаробных прыборах. У канцы мерапрыемства бібліятэкар уручыла брашуры з правіламі пажарнай бяспекі.

Павіццеўская ПБ, 20 чал.

***26 ліпеня***

У цёплай атмасферы прайшоў вечар-сустрэча “Бабушки и внуки не знают скуки”. Бабулі падзяляліся пацешнымі гісторыямі з жыцця ўнукаў, назвалі самую шчаслівую падзею са свайго жыцця. Дзеці расказвалі, чым займаюцца разам са сваімі бабулямі. Творчы конкурс “Наше хобби” расчыніў таленты дзяцей і сталых. Працягнуўся вечар вясёлымі конкурсамі. Удзельнікі ўспаміналі прыказкі і прымаўкі, герояў любых казак, разгадвалі загадкі. У канцы мерапрыемства бабулям уручаны дыпломы “Самой лучшей бабушке в мире”, а ўнукі атрымалі сувеніры.

Арэхаўская ПБ, 35 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

***8 ліпеня***

У нядзельнай школе храма Ушэсця Гасподняга аг. Гарадзец бібліятэкары запрасілі на пазнавальна-забаўляльную праграму “Все счастья хотят, но какое оно?”, прысвечаную Дню сям'і, кахання і вернасці. Праведзены гістарычны экскурс “Чудо о Петре и Февронии”, расказана гісторыя Мурамскіх святых. Сямейныя пары расказвалі пра свае сямейныя традыцыі, успаміналі прыказкі і прымаўкі пра сям'ю, дзяляліся сакрэтамі свайго сямейнага шчасця, прымалі ўдзел у сямейнай віктарыне і конкурсах, па выніках якіх былі вызначаны пераможцы ў розных намінацыях. Настаяцель храма Ушэсця Гасподняга аг. Гарадзец іерэй Георгі Червякоўскі, пажадаў прысутным захоўваць сямейнае шчасце, каханне і веру. Для ўсіх гасцей арганізавана святочнае чаяпіцце.

Гарадзецкі філіял,57 чал.

***8 ліпеня***

Летняе пасяджэнне клуба “Дзіва”, прысвечанае Дню сям'і, кахання і вернасці, літаратурна-музычнае свята “О счастье семейном молятся” адбылося па ініцыятыве настаяцеля Свята-Прачысценскай царквы айца Валерыя. Адкрылася свята кніжнай выставай “Да духоўнасці – праз кнігу”. Бібліятэкар расказала гісторыю жыцця і кахання Мурамскіх святых, праваслаўная спявачка Святлана Капылава выканала музычную баладу, Аня Барадзіна працягнула святочнае пасяджэнне песняй “Гімн

сям'і”. Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыяй. Айцец Валерый павіншаваў усіх гасцей са святам.

Дзівінскі філіял, 200 чал.

***16 ліпеня***

У рамках святочных мерапрыемстваў да Дня горада адбылася ўрачыстая цырымонія, прысвечаная адкрыццю гістарычнай шыльды на плошчы Замкавай, якая з даўніх часоў была цэнтрам палітычнага і дзелавога жыцця Кобрына, сведкай многіх бурных падзей, якія ўвайшлі ў гісторыю нашага горада. Цэнтральная раенная бібліятэка прыняла актыўны ўдзел у гэтай знакавай падзеі. Арганізаваны парад выстаў “Горад, у якім мы жывем”. ***(****Кобрынскі веснік, 2018, 18 ліп.; Кобрин-информ, 2018, 19 июля).*

***18 ліпеня***

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі працягваецца работа ў рамках праекта “Разговорный клуб английского” (English Speaking Club). Прайшло чарговае пасяджэнне па тэме «Вывучаем прыроду - спазнаём сябе». Вядучыя расказалі пра самыя найпрыгажэйшыя месцы свету. Занятак суправаджаўся паказам відэароліка.

ЦРБ, 35 чал.

***18 ліпеня***

У рамках Года малой радзімы Магдалинская публічная бібліятэка правяла творчы вечар паэта, кампазітара Аляксея Кірыеўскага “Музыка душы”. Увазе прысутных прадстаўлена выстава тэматычных папак, дыпломаў, фатаграфій, дыскаў аўтара песень. Са словамі віншаванняў у адрас А. Кірыеўскага выступілі ганаровыя госці свята – кіраўнік народнага аматарскага аб'яднання “Белы бусел” Л. Лазюк, кіраўнік Кобрынскага РООО “БелТІЗ” У. Смехович і паэтка Н. Момлик. Музычныя і песенныя выступленні З. Веремко, Т. Гурыш, А. Давідзюка, У. Салаўя і прадстаўнікоў ансамбля “Кобрынскі гармонік” сталі выдатным падарункам усім прысутным у зале.*(Кобрынскі веснік, 2018, 26 ліпеня).*

*Магдалінская ПБ, 50 чал.*

***22 ліпеня***

На гадзіну карысных парад “Витаминный калейдоскоп” бібліятэкар запрасіла фельчара мясцовай амбулаторыі Падайку Н.І., якая расказала  аб правільным харчаванні. Госці даведаліся, у якіх гародніне і садавіне больш за ўсё вітамінаў і як правільна гатаваць ежу. Увазе сабраных прадстаўлена кніжная выстава  “Здоровое питание – здоровая нация”. Напрыканцы мерапрыемства кожны ўдзельнік атрымаў падрыхтаваную бібліятэкарам памятку “Магія вітамінаў”.

*Восаўская ПБ, 32 чал.*

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81